ПАДЗЕЯ

# ПАМЯЦЬ У РАДКАХ І СЭРЦАХ

**БАРАНАВІЧЫ. У раённым цэнтры ўшанавалі памяць паэта-земляка.**

28 лістапада ў Цэнтральнай бібліятэцы г. Баранавічы імя В. Таўлая адбылася літаратурная вечарына, прысвечаная памяці паэта Алеся Корнева. Алеся Касьянавіча не стала ў сакавіку 2022 года. Ён быў членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, актыўным удзельнікам літаратурнага аб’яднання «Купальскія зоры», цікавым і вельмі таленавітым паэтам, цудоўным чалавекам. Пасля сябе Алесь Корнеў пакінуў 32 паэтычныя зборнікі.




Сярод удзельнікаў вечара памяці родныя і блізкія паэта. Падзея аб’яднала прыхільнікаў яго творчасці, аматараў мастацкай літаратуры, студэнтаў Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта і Тэхналагічнага каледжа. Члены Баранавіцкага літаратурнага аб’яднання «Купальскія зоры» падзяліліся ўспамінамі пра сябра, прачыталі вершы, прысвечаныя Алесю Касьянавічу, яго светлай памяці. Гучалі песні, кранальныя словы павагі, удзячнасці і смутку. Вобраз баранавіцкага паэта Алеся Корнева, нашага калегі па СПБ жыве і будзе жыць не толькі ў радках літаратурных твораў, але і ў сэрцах землякоў.

**Таццяна ЯЦУК**
член Саюза пісьменнікаў Беларусі,
кіраўнік літаратурнага аб’яднання «Купальскія зоры»

**На здымках:** літаратурная вечарына, прысвечаная памяці паэта Алеся Корнева. Цэнтральная бібліятэка г. Баранавічы імя В. Таўлая, 28 лістапада 2025 года.



Сярод удзельнікаў вечара памяці родныя і блізкія паэта


ВЫХОД
КАНТ






Кожны дзень мой – асаблівы
(Я яго з мінулым зверыў!),
Кожны дзень ва мне – прылівы
І жаданняў, і намераў!
Алесь Корнеў
АЛЕСЬ КОРНЕЎ
Мядовы волас
Нязгаслыя яскі
СПАРЫШ
БАРАНОВИЧИ
Стих и я






[www.pisateli.by](http://www.pisateli.by)